Пролетары! Ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б
і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 285 (354)
ЧАЦВЕР
12
СНЕЖНЯ
1940 г.

Цана 10 капеек.

15 снежня 1940 г.—выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных

Грамадзяне і грамадзянкі! Усе як адзін з'явімся да выбарчых урнаў і аднадушна будзем галасаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

ТАРЖАСТВО СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ДЭМАКРАТЫЗМА

Тры годы таму назад—12 снежня 1937 года—адбыліся выбары дэпутатаў у вышэйшы орган улады социялістычнай дзяржавы—Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

У гэты гістарычны дзень многамільённы совецкі народ аднадушна галасаваў за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, за партыю Леніна—Сталіна, за яе ўнутраную і знешнюю палітыку, за Совецкі ўрад, за далейшы росквіт сваёй радзімы, за шчаслівае жыццё.

98,6 процанта ўсіх выбаршчыкаў, якія ўдзельнічалі ў галасаванні, галасавалі за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

З велізарным лікаваннем, радасцю, аднадушшам першым дэпутатам Вярхоўнага Совета выбран геній чалавецтва Іосіф Вісарыёнавіч Сталін і яго слаўныя саратнікі таварышы: В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, Л. М. Кагановіч, М. І. Калінін, А. А. Андрэеў, А. І. Мікаян, А. А. Жданаў, Н. С. Хрушчоў.

Аб сапраўды народным характары Совецкага ўрада гаворыць састаў дэпутатаў, выбраных у Вярхоўны Совет СССР.

З 1.143 выбраных дэпутатаў у Вярхоўны Совет увайшло 855 комуністаў і 288 беспартыйных. Гэта яркае сведчанне таго, наколькі бязмежны аўтарытэт у комуністычнай партыі большэвікоў. У ліку выбраных дэпутатаў 480, або 42 процанты ўсяго саставу Вярхоўнага Совета СССР—рабочыя, 337 дэпутатаў, або 29,5 процанта—сяляне, 326 дэпутатаў, або 28,5 процанта—совецкая інтэлігенцыя. У дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР выбрана 189 жанчын. У Совеце Нацыянальнасцей прадстаўлен вялікі многанацыянальны совецкі народ.

Выбары ў Вярхоўны Совет СССР прайшлі пры выключна высокай палітычнай актыўнасці насельніцтва нашай краіны. І гэта законамерна. Калі ў капіталістычных краінах пануючыя класы зацікаўлены ў палітычнай пасіўнасці насельніцтва, то «у нас, у нашай краіне,—гаворыць таварыш Сталін,—наадварот, выбары праходзяць у зусім іншай абстаноўцы. У нас няма капіталістаў, памешчыкаў, стала-быць, і няма даўлення з боку маёмных класаў на немаёмных. У нас выбары праходзяць у абстаноўцы супрацоўніцтва рабочых, сялян і інтэлігенцыі, у абстаноўцы ўзаемнага іх давер'я, у абстаноўцы, я-б сказаў, узаемнай дружбы, таму што ў нас няма капіталістаў, няма памешчыкаў, няма эксплаатацыі і няма каму, уласна, давіць на народ для таго, каб сказіць яго волю».

12 снежня 1937 года совецкі народ прышоў да выбарчых урнаў з баявымі лозунгамі комуністычнай партыі большэвікоў, дадзенымі ў гістарычным звароце ЦК ВКП(б) да ўсіх выбаршчыкаў.

За тры годы з дня выбараў у Вярхоўны Совет СССР наша краіна пад кіраўніцтвам партыі і ўрада атрымала буйнейшыя сусветна-гістарычнага значэння перамогі. Наша краіна хуткімі тэмпамі ідзе па шляху дасягнення багацця ўсякіх прадуктаў. Прадукцыя дзяржаўнай прамысловасці агульнасаюзных і саюзна-рэспубліканскіх прамысловых наркаматаў дасягнула к 1 студзеня 1940 года 96,5 мільярда рублёў. Прырост прадукцыі ў параўнанні з 1938 годам склаў 14,7 процанта. Гэта вышэй узроўню задання трэцяй пяцігодкі, намецішай сярэднегадавы прырост прадукцыі на 14 процантаў. Выкананне планаў прамысловасцю за 1940 год чакаецца з прыростам 13,6 мільярда рублёў, або на 11 процантаў больш у параўнанні з 1939 годам. Гэта без уліку прамысловасці заходніх абласцей Украіны і Беларусі і новых совецкіх рэспублік.

Адным з велізарных заваяванняў совецкага народа з'яўляецца тое, што народы заходніх абласцей Украіны і Беларусі, Бесарабіі, Паўночнай Букавіны і Прыбалтыкі назаўсёды вызвалены ад капіталістычнага прыгнечання і з'едцаны з народамі вялікага Совецкага Саюза. Совецкі Саюз з 11 саюзных рэспублік павялічыўся да 16 саюзных рэспублік. 23 мільёны працоўных далучыліся да Совецкага Саюза і прыступілі да актыўнага соцыялістычнага будаўніцтва. СССР—краіна соцыялізма, як яркі маяк паказвае шлях да шчасця народам усяго свету.

20 год «будавалі» польскія паны Днепра-Бугскі канал, а пабудавалі ўсяго толькі два шлюзы. Вызвалены народ з дапамогай совецкай улады за адзін год праклаў 202 кілометры канала, пабудаваў пяць шлюзаў пяць вадаспускаў і дзве плаціны. Цяпер канал звяжа Чорнае мора з Прыбалтыкай.

Тэкстыльшчыкі Беластока спаборнічаюць за выпуск 12 з паловай мільёнаў метраў тканіны, за тое, каб 1941 год сустрэць падвоенай выпрацоўкай тканіны ў параўнанні з 1939 годам.

Совецкая краіна 1940 год заканчвае вялікімі поспехамі ў справе будаўніцтва новых прадпрыемстваў. Гатовы к пуску Угліцкая электрастанцыя на 110 тысяч кіловат, Чырчыцкая станцыя (Узбекістан) магутнасцю першай чаргі ў 43 тысячы кіловат. А такіх новабудоўляў многа!

Совецкі Саюз з яго неабсяжнай тэрыторыяй, багатай усімі відамі харчавання і сыравіны, з яго сучаснай аснашчонай навейшай тэхнікай прамысловасцю, з яго магутнейшай арміяй і палітыка-маральным адзінствам усіх насяляючых яго народаў валодае велізарнай перавагай у параўнанні з капіталістычным светам, які гарыць у полымі другой імперыялістычнай вайны. Магутнасць Совецкага Саюза расце з кожным днём.

15 снежня свабодныя народы заходніх абласцей Беларусі і Украіны прыдуць да выбарчых урнаў, каб аддаць свае галасы за лепшых сыноў радзімы—кандыдатаў народа ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Гэты дзень будзе новай магутнай дэманстрацыяй згуртаванасці народа вакол партыі Леніна—Сталіна, Совецкага ўрада і вялікага Сталіна. Гэты дзень будзе новым таржаством соцыялістычнага дэмакратызма. Кожны выбаршчык, галасуючы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, будзе галасаваць за далейшыя поспехі соцыялістычнага будаўніцтва.

Дзень 15 снежня будзе днём вялікага свята еднання працоўных усіх нацыянальнасцей заходніх абласцей БССР вакол пабеданоснага сцяга партыі Леніна—Сталіна.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР

АБ АСЛАБАНЕННІ АД АСНОЎНАЙ РАБОТЫ СТАРШЫНЬ АБО САКРАТАРОЎ УЧАСТКОВЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ ПА ВЫБАРАХ У МЯСЦОВЫЯ СОВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ У БАРАНАВІЦКАЙ, БЕЛАСТОЦКАЙ, БРЭСЦКАЙ, ВІЛЕЙСКАЙ І ПІНСКАЙ АБЛАСЦЯХ БССР

Устанавіць, што старшыні або сакратары ўчастковых выбарчых камісій па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных у Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай і Пінскай абласцях аслабаняюцца ад сваёй асноўнай работы з захаваннем аплаты па месцу пастаяннай работы на адзін дзень да дня выбараў і на адзін дзень пасля выбараў.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Л. ПАПКОЎ.

9 снежня 1940 г. г. Мінск.

Народнаму паэту Беларускай ССР акадэміку Янку Купале

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі горача вітае Вас, любімага паэта беларускага народа, выдатнага дзеяча совецкай культуры з трыццаціпяцігадовым юбілеем Вашай літаратурнай і грамадскай дзейнасці.

З першых дзён Вашай творчасці ўвесь свой яркі талент вялікага майстра Вы аддавалі на службу народу, натхняючы яго ў барацьбе за соцыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя вызваліла беларускі народ ад прыгнятальнікаў, яна адкрыла ўсе магчымасці шырока разгарнуцца творчым сілам, здольнасцям і выдатным якасцям беларускага народа. За годы совецкай улады пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі бурна расквітнела беларуская культура і разам з ёю расквітнеў і высока падняўся Ваш талент выдатнага мастака слова. З'яўляючыся асновапаложнікам беларускай літаратуры, Вы ідзеце ў першых радах дзеячоў беларускай культуры, вырашчаных і выхаваных партыяй Леніна — Сталіна. Вашы песні сталі здабыткам усяго совецкага народа, яны натхняюць працоўных на барацьбу за заваяванне новых перамог комунізма, яны прасякнуты гарачай любоўю да соцыялістычнай радзімы, да нашага народа, да вялікага Сталіна.

Ваш юбілей ёсць сведчанне перамог ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, забяспечыўшай усім народам Совецкага Саюза нябачаны ўздым культуры, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б жадае Вам бадзёрасці, здароўя, многіх год пладатворнай работы і новых поспехаў у Вашай далейшай творчасці на карысць усіх працоўных вялікага Совецкага Саюза, пабеданосна будуючых пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна комуністычнае грамадства.

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі.

Дарагі Іван Дамінікавіч!

У дзень 35-годдзя Вашай слаўнай паэтычнай дзейнасці Совет Народных Камісараў БССР шле Вам большэвіцкае прывітанне і пажаданне многіх і многіх год жыцця і творчасці на карысць нашага народа.

На працягу Вашага паэтычнага шляху ад першай рускай рэволюцыі і да нашых дзён, Вы, Іван Дамінікавіч, верна служылі свайму народу. Пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі Вашы песні загучэлі па-новаму, яны апяваюць радасць вызвалення і росквіт жыцця беларускага народа.

Комуністычная партыя (большэвікоў), вялікі Сталін, совецкая ўлада, усе народы Совецкага Саюза высока цэняць Ваш выдатны талент мастака і заслужана ўзнагародзілі Вас вышэйшай узнагародай — ордэнам Леніна і званнем народнага паэта БССР.

Вы, тав. Купала, з'яўляецеся песняром беларускага народа, класікам беларускай літаратуры. На Вашых творах вучацца жыць, працаваць, змагацца і будаваць новае грамадства мільённыя масы працоўных.

У дружнай сям'і народаў вялікага Совецкага Саюза, дзякуючы клопатам вялікага Сталіна, Беларусь з ранейубогай і адсталай краіны ператварылася ў перадавую соцыялістычную ордэнаносную рэспубліку. У сваіх вершах і паэмах Вы, тав. Купала, апяваеце слаўныя перамогі аб'яднанага 10-мільённага беларускага народа. Совецкі народ любіць і цэніць Вашу творчасць і чакае ад Вас новых выдатных твораў аб росквіце нашай радзімы, аб шчасці народа, яго творчай працы, твораў, якія будуць натхняць на новыя перамогі, на барацьбу за таржаство комунізма.

Совет Народных Камісараў Беларускай ССР.

НА ЎРАЧЫСТЫМ ПАСЯДЖЭННІ, ПРЫСВЕЧАНЫМ 35-ГОДДЗЮ ЛІТАРАТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ

8-га снежня працоўныя рэспублікі і сталіцы БССР адсвяткавалі 35-гадовы юбілей літаратурнай дзейнасці свайго любімага паэта-ордэнаносца Янкі Купалы. Больш тысячы чалавек сабралося ў Дзяржаўным Вялікім ордэна Леніна тэатры оперы і балета БССР на ўрачысты вечар, прысвечаны юбіляру.

Кароткай уступнай прамовай адкрывае вечар народны камісар асветы БССР тав. Уралава.

У прэзідыум аднадушна выбіраюцца тт. Панамарэнка, Кулагін, Былінскі, Наталевіч, Цанава, Малін, М. Захараў, Матвееў, Эйдзінаў, Аўхімовіч, Ванееў, І. Захараў, Паўлаў, Уралава, Зімянін, Горэў, Янка Купала, Якуб Колас, Лынькоў, Бядуля, Крапіва, Броўка, Глебка, Пестрак, Клімковіч, Чорны, Аксельрод, Бранеўская, маскоўскія паэты А. Суркоў, С. Гарадзецкі, С. Галкін, літоўскія совецкія пісьменнікі А. Венцлава і Н. Цвірка, украінскі паэт Масенка, народная артыстка СССР Александроўская, тт. Гарбуноў, Фешчанка, Эрнгрос, Рэпінскі, Цёмкін, Бударын, Власаў, Дадзіомава, Туранкоў, Белкін (калгас «X з'езд Советаў»), Каган (завод імені Кірава), Карасік (завод імені Варашылава) і іншыя.

З вялікім уздымам пад доўга не змаўкаючыя апладысменты выбіраецца пачотны прэзідыум у саставе членаў Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з вялікім Сталіным.

Даклад аб 35-годдзі літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы зрабіў акадэмік С. Я. Вальфсон.

Ад імені ЦК КП(б)Б юбіляра віншуе сакратар ЦК КП(б)Б тав. Малін, ад імені Соўнаркома БССР з прывітаннем выступіў намеснік Старшыні Соўнаркома тав. Ванееў.

З яркай прывітальнай прамовай ад імені Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР выступіў паэт А. Суркоў.

Паэты Гарадзецкі і Масенка прачыталі свае вершы, прысвечаныя юбіляру.

Выступае нарком асветы Літоўскай ССР Антанас Венцлава.

— Разам з прадстаўнікамі другіх брацкіх рэспублік, — гаворыць ён, — літоўскія пісьменнікі на гэтым святе соцыялістычнай культуры перадаюць гарачае прывітанне ўсяго літоўскага народа песняру беларускага народа. Заключныя словы тав. Венцлава, якія ён прысвячае комуністычнай партыі і вялікаму Сталіну, пакрываюцца працяглымі апладысментамі.

Затым юбіляра вітаюць пісьменнікі Кандрат Крапіва, Філіп Пестрак, С. Галкін, народная артыстка СССР Л. П. Александроўская, дырэктар інстытута літаратуры Акадэміі навук БССР тав. Барысенка, канструктар станкабудаўнічага завода імені Кірава тав. Каган і група дзяцей Палаца піонераў.

Слова прадастаўляецца народнаму паэту БССР Янку Купале. Зал горача сустракае паяўленне юбіляра на трыбуне. У сваёй адказнай прамове, пранікнутай пачуццём гарачага совецкага патрыятызма, народны паэт расказвае аб вялікай радасці жыць і тварыць пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

— У гэты светлы дзень я хацеў-бы. каб мой усхваляваны голас дайшоў да Крэмля і каб вялікі Сталін адчуў, якой удзячнасцю і любоўю напоўнена сэрца беларускага народа к яму, стваральніку нашай дзяржавы, тварцу самай дэмакратычнай у свеце канстытуцыі

Сталін — крыніца нашага жыцця і росквіту, натхніцель нашых дум і песень. вялікі каваль чалавечага шчасця. Няхай жыве наш родны Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

У зале ўспыхвае і доўга не змаўкае авацыя ў чэсць генія чалавецтва, любімага і мудрага правадыра таварыша Сталіна.

З велізарным уздымам удзельнікі ўрачыстага вечара прынялі тэкст прывітальнай тэлеграмы правадыру народаў таварышу Сталіну.

У заключэнне адбыўся канцэрт з удзелам артыстаў Дзяржаўнага Вялікага ордэна Леніна тэатра оперы і балета БССР.

(БЕЛТА).

Сустрэнем дзень выбараў новымі вытворчымі перамогамі

Дадзім звыш плана 35 тысяч метраў высокаякасных тканін

На працягу апошніх двух месяцаў выбарчай кампаніі тэкстыльная фабрыка № 29 дабілася вялікіх вытворчых перамог. Штомесячна калектыў фабрыкі перакрывае сваё вытворчае заданне, выпускае высокую якасць прадукцыі. Усе ткачы выконваюць норму выпрацоўкі.

З кожным днём колькасць стаханаўцаў і ўдарнікаў на фабрыцы павялічваецца. Калі ў кастрычніку было 57 стаханаўцаў і 90 ударнікаў, то цяпер налічваецца 80 стаханаўцаў і 102 ударнікі.

На фабрыцы шырока разгорнута індывідуальнае соцыялістычнае спаборніцтва, якім ахоплены амаль усе рабочыя. Па ткацкаму цэху спаборнічаюць паміж сабой 186 ткачоў, на прадзільнаму — 78.

Стары стаханавец-ткач тав. Ліпскі выканаў ужо сваю гадавую вытворчую праграму. Калектыў фабрыкі № 29 спаборнічае з 1-й Кіеўскай прадзільна-ткацкай фабрыкай І ў гэтым спаборніцтве калектыў 29-й фабрыкі стараецца заваяваць першынства.

Фабрыка мае многа добрых грамадчыкаў, агітатараў. Цяпер у выбарчай кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных удзельнічае звыш 60 чалавек. Кандыдатамі ў дэпутаты абласнога і гарадскога Советаў з ліку перадавых людзей фабрыкі вылучаны лепшыя людзі, як тт. Вільчэўская, Камельман, Кішвінскі, Конанаў. Сваёй чэснай і адданай працай яны ўдастоіліся гэтай высокай чэсці. Калектыў фабрыкі, вылучыўшы іх у мясцовыя Советы, упэўнен, што яны апраўдаюць высокае давер'е народа.

8-га снежня на фабрыцы адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны выбарам у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных і атрыманню пераходнага чырвонага сцяга беластоцкага тэкстыльнага трэста і абкома Саюза шарсцянікаў, на які сабралося 600 чалавек. Яны звярнуліся з заклікам да ўсіх выбаршчыкаў Прамысловага выбарчага ўчастка № 42 дастойна сустрэць дзень выбараў. Калектыў абавязаўся да 17 снежня 1940 года выканаць гадавую праграму і да канца года даць дадаткова краіне 35 тысяч метраў высокаякаснай тканіны.

А. Міронава.

ВЫКАНАЛІ ГАДАВЫ ПЛАН

Калектыў беластоцкага скурзавода № 2, шырока разгарнуўшы соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, выканаў гадавы план на 100 процантаў, выпусціўшы тавараў на 1.518 тысяч рублёў.

Да канца года завод выпусціць дадаткова 50 тон жорсткіх тавараў на 130 тысяч рублёў.

Г. Ацяскін,
дырэктар скурзавода № 2,
А. Касцюк,
старшыня заўкома.

* * *

Разгортваючы соцыялістычнае спаборніцтва, калектыў беластоцкага маслабойнага завода датэрмінова выканаў гадавы план па вырабу масла. У грашовым выразе гэта складае 112 процантаў плана.

Калектыў абавязаўся да канца года даць звыш плана 500 тысяч кілограмаў масла.

Ш. Шварц.

Высокапрадукцыйнай работай сустракаюць выбары

Актыўна рыхтуецца да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных калектыў скурзавода № 1. Новымі вытворчымі поспехамі імкнуцца рабочыя сустрэць гэты знамянальны дзень. Лістападаўскую праграму калектыў скурзавода выканаў на 146,5 процанта.

Лепшых паказчыкаў у сваёй рабоце дабіўся дубільшчык Русаковіч, які выконвае норму выпрацоўкі на 311 процантаў, Карач — на 278 процантаў, Олешчук — на 232 проценты.

Да 13 снежня калектыў абавязаўся выканаць гадавую вытворчую праграму.

ВЫКАНАЛІ ПЛАН ЧАЦВЕРТАГА КВАРТАЛА ПА РАМОНТУ ТРАКТАРАЎ

Уключыўшыся ў соцыялістычнае спаборніцтва, трактарысты Парэцкай МТС узялі на сябе абавязацельства датэрмінова выканаць заданне 4-га квартала па рамонту трактараў. План капітальнага і бягучага рамонту выканан поўнасцю.

Выканалі план 4-га квартала па бягучаму рамонту трактараў Ломжынская, Чыжаўская, Дамбраўская машынна-трактарныя станцыі.

Хто імкнецца да таго, каб наша радзіма была і надалей магутнай і свабоднай, той будзе галасаваць за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Лейб Беркавіч Грабоўскі.

Марыя Аляксандраўна Галенка.

Валенціна Юльянаўна Арцішэўская.

Ольга Андрэеўна Налівайка.

Вера Іванаўна Ражко.

Валенціна Мітрафанаўна Кавалеўская.

Апалінарыя Васільеўна Цітова.

Нікалай Канстанцінавіч Багнюк.

★ ★ ★

МАЛАДЫЯ КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ БЕЛАСТОЦКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

Буржуазная канстытуцыя былой Польшчы не дапускала да выбараў моладзь да 24-гадовага ўзросту і не давала права быць выбранымі грамадзянам да 30 год. Сталінская Канстытуцыя забяспечвае за ўсімі грамадзянамі СССР, дасягнуўшымі 18 год, права выбіраць і быць выбранымі. Сёння мы расказваем аб маладых кандыдатах у гарадскі Совет дэпутатаў працоўных, якім народ аказаў вялікае давер'е. Як дастойныя прадстаўнікі маладога пакалення совецкага народа, яны аддадуць усе свае сілы на чэснае служэнне інтарэсам працоўных.

Валенціна Юльянаўна Арцішэўская

Гэта адна з самых маладых кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных: толькі ў гэтым годзе ёй споўнілася 18 год. Але ёй належыць па Сталінскай Канстытуцыі вялікае права—выбіраць і быць выбранай у Совет.

Калі на агульным сходзе рабочых і служачых 1-й дыстанцыі сувязі станцыі Беласток абмяркоўваліся кандыдатуры ў гарадскі Совет дэпутатаў працоўных, сход аднадушна назваў імя Валенціны Арцішэўскай, як здольнай дзяўчыны з рабочай сям'і, актыўнай комсамолкі. Толькі совецкая ўлада адкрыла перад ёй светлы шлях да вучобы, да творчай работы, да раднаснага жыцця.

Яшчэ год назад Валя жыла ў бацькі на ўтрыманні, бо пасля сканчэння паўшэхнай школы вучыцца ёй не давялося: дорага было плаціць за вучобу. Гэта было вялікай пакутай для дзяўчыны, якая добра вучылася і горача хацела працягваць адукацыю. Але бацька на свой заработак ледзь мог толькі пракарміць сям'ю з пяці чалавек.

Непрасветнае было жыццё, ні променю надзеі на лепшае.

Але сонца засвяціла над роднымі прасторамі: з усходу прышла Чырвоная Армія — вызваліцельніца. І юная дзяўчына Валя адразу-ж паступае вучыцца на курсы тэлеграфістак. Шэсць месяцаў совецкая дзяржава плаціла ёй стыпендыю за час вучобы, і яна ва ўдзячнасць за гэта скончыла курсы на «выдатна». Тады-ж уступіла ў комсамол.

Пасля курсаў Валя прайшла практыку,—і тут у яе ўзнікла вялікая любоў да тэхнікі, жаданне яшчэ больш пазнаць электрасувязь. Яна паступае на курсы механікаў электрасувязі і канчае іх з поспехам. Зараз яна разам з вопытнымі механікамі працуе на мантажы новай тэлефоннай станцыі.

— Скора буду механікам электрасувязі — вось мая вялікая радасць у жыцці. Але яшчэ большая радасць—тое, што працоўныя аказалі мне такое велізарнае давер'е, калі вылучылі кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета дэпутатаў працоўных. Я-ж усе сілы аддам, каб аддзякаваць чэснай работай соцыялістычнай радзіме, каб апраўдаць на справе вялікае давер'е маіх выбаршчыкаў,—гаворыць т. Арцішэўская.

Майсей Іосіфавіч Бэз

14-гадовым юнаком Майсей стаў працаваць вучнем-ткачом у ленкетніка. Гэта была нялёгкая справа. Пэпэзсаўскія кіраўнікі профсаюзаў не дапускалі моладзь да аўладання прафесіяй ткача, бо гэта павялічвала колькасць патрабуючых работы. Прышлося хавацца ад профсаюзнага кантролю, працаваць дарма і яшчэ заплаціць гаспадару за вучобу 50 злотых. Бацька Майсея, таксама ткач, працаваў толькі 4—5 месяцаў у год, астатнія-ж месяцы быў беспрацоўным. Сям'я складалася з сямі душ. Прыходзілася пераносіць пастаянную нястачу. Па сканчэнні вучобы Майсей працуе ў другога ланкетніка, які плаціць яму за тыдзень работы толькі 5 злотых замест існуючай расцэнкі 35 злотых. У такіх умовах прышлося працаваць да 1936 года.

У 1933 годзе бастуюць рабочыя фабрык у Супраслі, бастуюць рабочыя плюшавай і іншых фабрык Беластока. Майсей ужо добра разумее, за што рабочыя вядуць барацьбу. Ён выконвае даручэнне комуністычнай арганізацыі — раскідвае адозвы, расклейвае лозунгі. У 1935 годзе ён уступае ў члены комуністычнага саюза моладзі, вядзе комуністычную агітацыю сярод рабочых тэкстыльшчыкаў. У 1938 годзе яго арыштоўваюць. Катуюць у дэфензіве. Садзяць у турму на 3 месяцы.

З перапынкамі Майсей працуе ткачом на фабрыцы Каца, Фукса. У 1937 годзе яму прышлося працаваць толькі 3 месяцы. Астатні час да снежня 1939 года быў беспрацоўным. Канец беспрацоўю быў пакладзен прыходам Чырвонай Арміі, устанаўленнем совецкага ладу. З снежня 1939 года Майсей працуе ткачом на 5-м тэкстыльным камбінаце.

У студзені 1940 года ён пераходзіць працаваць на двух станках. Цяпер з'яўляецца брыгадзірам комсамольска-маладзёжнай брыгады двухстаночнікаў.

Майсей—лепшы стаханавец. У кастрычніку вытворчае заданне выканаў на 115 процантаў, у лістападзе — на 107,7 процанта.

Калектыў работнікаў 5-га тэкстыльнага камбіната вылучыў 20-гадовага Майсея Іосіфавіча кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета дэпутатаў працоўных па 35-й выбарчай акрузе.

Марыя Аляксандраўна Галенка

Ёй толькі 23 годы, а за плячыма яе немалы шлях рэволюцыйнай барацьбы. Дачка беднага селяніна з вёскі Дубіны, зараз Гайнаўскага раёна, Брэсцкай вобласці, Маруся Галенка з 11-ці год пачала працоўнае жыццё. Скончыўшы толькі паўшэхную школу, яна пайшла працаваць па ачыстцы і пасадцы лесу. У 15 год яна паступіла служыць да папа, але скора ўцякла ад яго. Цяжкія ўмовы былі ў «бацюшкі». Тут Маруся зразумела папоўскую хлусню аб Хрысце і раі. Рай быў на зямлі — для багацеяў, пекла — на зямлі—для прыгнечаных. І яна пайшла ад папа бязбожніцай.

Яна сустрэла людзей, якія адкрылі ёй праўду жыцця. У вёсцы арганізавалася падпольная комсамольская ячэйка з 5 чалавек, і сярод іх адна дзяўчына Маруся Галенка. Вялікую і небяспечную работу вялі комсамольцы. Яны расказвалі сялянскай моладзі аб вялікай совецкай краіне, вялі рэволюцыйную прапаганду, гаварылі аб МОПР'ы, збіралі грошы ў дапамогу вязням капітала. Комсамольцы збіралі подпісы пад масавым пратэстам супроць смяротнага прыгавору Сяргею Прытыцкаму. Комсамольцы арганізоўвалі сялян на барацьбу супроць шарваркаў. Сумесна купілі радыёпрыёмнік і калектыўна слухалі перадачы з Масквы і Мінска.

Шпікі высачылі комсамольцаў. У час аднаго схода ў лесе паліцыя ўсіх разагнала гумавымі палкамі. Пачаліся арышты. Арыштавалі і Марусю Галенка. Сталі дапытваць:

— Ты які лозунг вышывала і насіла на сход?

—Лозунг? А што такое лозунг? Я не разумею лозунгаў.

— А ў ячэйцы комсамольскай састаіш?!

— Я ў ячэйкі не хаджу, я ведаю—ёсць кампанія дзяўчат, і я з імі толькі гуляла.

Марыя прыкінулася просценькай і не выдала сябе і сваю арганізацыю. Яе выпусцілі. Але правакатары не пакідалі комсамольцаў. Праз два годы ў Гайнаўцы дэфензіва правяла масавыя арышты, і сярод 50 комсамольцаў была Маруся Галенка. Шэсць дзён яе дапытвалі ў Бельску, потым закаваную ў кайданы з завязанымі вачыма ўночы перавезлі на аўтамашыне ў Беласток. У чорнай камеры катоўні ёй каты лілі халодную ваду ў нос, пакуль дзяўчына страціла прытомнасць. Але і на гэты раз яна нічога не сказала. Адвезлі ў Бельск, адтуль зноў у Беласток, у турму. Год яна прахварэла ў турме, потым быў суд, які прыгаварыў яе да 5 год турмы за тое, што «мела справу з комуністамі».

Два з паловай годы прасядзела ў турме тав. Галенка, пакуль прышла Чырвоная Армія і вызваліла ўвесь народ Заходняй Беларусі. Яна акунулася ў грамадскую работу. Сяляне выбралі яе ў сельскі камітэт. Потым тав. Галенка выбіраюць дэпутатам у Народнае Сабранне. На лесапільным заводзе ў Гайнаўцы, куды яна паступіла працаваць, рабочыя выбралі яе намеснікам старшыні заводскага камітэта. Але Маруся адчувала, што ёй трэба вучыцца, яна хацела вучыцца і паступіла на падрыхтоўчы курс Беластоцкага педвучылішча.

Зараз Маруся Галенка—студэнтка 1-га курса педвучылішча. Яе выбралі старастай курса, намеснікам сакратара комсамольскага камітэта, старшынёй культкамісіі. Выконваючы вялікія грамадскія абавязкі, яна і ў вучобе з'яўляецца выдатніцай. Калектыў педвучылішча і рабфака вылучыў яе кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета па 45-й выбарчай акрузе.

Ольга Андрэеўна Налівайка

Пара яе свядомага юнацтва азнаменавалася вялікім шчасцем: здзейсніліся светлыя мары яе дзяцінства, ажыццявілася тое, да чаго зачынялі доступ польскія ўлады. Толькі пры совецкай уладзе Оля Налівайка атрымала магчымасць вучыцца, стала студэнткай педагагічнага інстытута.

Бацьку яе — беларуса — польскія заправілы не давалі працаваць на чыгунцы. Яго, кваліфікаванага сцэпшчыка паяздоў, адразу-ж звольнілі, як прышлі да ўлады пілсудчыкі. Настаў час беспрацоўя, галадала ўся сям'я, пакуль бацьку сяк-так удалося паступіць чорнарабочым на вугальны склад. Дзеці Налівайкі былі здольныя да навукі. Старэйшыя сёстры з медалямі пераходзілі з класа ў клас. Але ім прышлося закінуць вучобу і пайсці шукаць работу.

Тое-ж здарылася і з Оляй. Пасля пачатковай школы яна хацела паступіць у гімназію, а не было чым плаціць. Трэба было шукаць іншых шляхоў да жыцця. І Оля ідзе вучыцца да краўчыхі, потым займаецца на курсах кройкі. Брат, які знайшоў работу, і старэйшыя сёстры на свой заработак сумесна рашылі плаціць за вучобу і пусціць меншую сястру ў гімназію. Але сустрэлася новая перашкода: Оля не вучылася пяць год, перарасла для першага класа гімназіі. І яна рашаецца паступіць у апошні клас, хоць і не мела для гэтага падрыхтоўкі. Прышлося за адно лета самастойна прайсці трохгадовы курс.

Пасля гімназіі выключна здольную вучаніцу прынялі ў Баранавіцкі ліцэй. А праз год у Заходнюю Беларусь прышла Чырвоная Армія, якая прынесла на сваіх сцягах мір і вызваленне працоўным. Сталінская Канстытуцыя дала працоўным вялікія правы. Больш не шукаюць работы брат і сёстры Ольгі Налівайка. А ёй адкрыт шлях да вышэйшай асветы. Оля паступіла на літаратурны факультэт Беластоцкага педагагічнага інстытута.

Яна лепшая студэнтка факультэта; любіць выбраную спецыяльнасць — вывучае родную беларускую мову і багатую літаратуру. А толькі-ж нядаўна польскія ўлады праследвалі беларуса за роднае слова. А так хацелася пачуць гэта слова, пачытаць беларускага паэта! На рынку тайком прадавалі беларускія календары, у іх былі змешчаны вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Танка. І хоць гэта не былі характэрныя — рэволюцыйна-палкія вершы гэтых паэтаў, а бяскрыўдная лірыка прыроды, — і то прыемна было зачытаць іх дома голасна.

Яшчэ ў 1939 г. Оля Налівайка першая ўступіла ў комсамол. Летам ёй комсамол даручыў важную работу важатай у піонерскім лагеры. У інстытуце—яна прафорг групы, выконвае розныя грамадскія даручэнні. З комсамольскім энтузіязмам авалодвае навукай студэнтка Оля Налівайка і мае выдатныя поспехі.

Як лепшую студэнтку, калектыў інстытута вылучыў тав. Налівайка кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета дэпутатаў працоўных па 119-й выбарчай акрузе.

Валенціна Мітрафанаўна Кавалеўская

Нарадзілася Валя Кавалеўская ў сям'і служачых у г. Рызе ў 1914 годзе. Пачалася імперыялістычная вайна, і сям'я Кавалеўскіх разам з патокам бежанцаў апынулася ў Віцебску. Бацька працаваў бухгалтарам, маці медыцынскай сястрой. Валя паспяхова вучылася ў школе. У 1928 годзе паступіла ў тэкстыльны тэхнікум, за тры годы скончыла яго і паслана была на вытворчасць прадзільным падмайстрам, праз год зменным майстрам, а затым — працуе ў аддзеле тэхнічнага кантролю фабрыкі.

У 1933 годзе трэст перавёў яе на тонкасуконную фабрыку ў Серпухаве намеснікам начальніка прадзільнага цэха. Праз год уступіла ў рады комсамола і працавала комсоргам ткацкага цэха. У 1934 годзе трэст паслаў яе працаваць на фабрыку імені Пятра Аляксеева начальнікам падрыхтоўчага цэха.

У 1937 годзе комсамолку Кавалеўскую пераводзяць на фабрыку «Победа труда» начальнікам апаратна-прадзільнага цэха. У 1938 годзе яе вылучаюць на пасаду начальніка рамонтна-механічнага аддзела, потым—першым намеснікам галоўнага механіка. У друку яе адзначаюць як лепшую стаханаўку сярод інжынерна-тэхнічных работнікаў.

У 1940 годзе наркамат тэкстыльнай прамысловасці перавёў тав. Кавалеўскую на пасаду галоўнага інжынера фабрыкі, а неўзабаве камандзіраваў у Беласток.

Яна прыбыла на 6-ты беластоцкі тэкстыльны камбінат. Пасля работы на совецкіх фабрыках у яе атрымалася цяжкае ўражанне ад вытворчасці, якую атрымала ў спадчыну совецкая ўлада. Але Кавалеўская добра памятала наказ у наркамаце: «Вы едзеце аднаўляць прамысловасць». І Кавалеўская ўзялася наладжваць вытворчасць. Зараз 6-ты тэкстыльны камбінат з'яўляецца перадавым прадпрыемствам Беластока. Рабочыя вельмі добра адносяцца да тав. Кавалеўскай, паважаюць і цэняць яе багаты вопыт і веды. Яна навяла культуру вытворчасці, правяла вялікую рэканструкцыю абсталявання. 6-ы камбінат атрымаў пераходны чырвоны сцяг. Наркамат узнагародзіў тав. Кавалеўскую значком «Выдатнік соцыялістычнага спаборніцтва тэкстыльшчыкаў».

Калектывам 6-га камбіната тав. Кавалеўская вылучана кандыдатам у гарадскі Совет дэпутатаў працоўных.

Нікалай Канстанцінавіч Багнюк

Імперыялістычная вайна загнала яго бацькоў з Беластока далёка на ўсход. У 1919 годзе ў горадзе Віцебску ў сям'і бежанца Канстанціна Багнюка нарадзіўся сын Нікалай. Брат і сястра бацькі асталіся ў Совецкай краіне, а сам Канстанцін вярнуўся з сям'ёй на радзіму. Дзве зусім непадобныя долі выпалі братам. Той, што астаўся ў совецкай краіне, з'яўляецца зараз палкоўнікам Чырвонай Арміі. А Канстанцін, які вярнуўся ў Беласток, сустрэў галечу і цяжкую непрасветную працу.

Бацька паступіў столярам на дайлідскую півварню, якую капіталісты Цыбулькін і Лернер арандавалі ў князя Любамірскага. Нікалай скончыў паўшэхную школу, потым сяк-так паступіў у камерцыйнае вучылішча. Але дорага каштавала вучоба: 15 злотых у месяц, а бацька не меў столькі грошай. І Нікалай даваў вечарамі рэпетытарскія ўрокі, каб мець чым плаціць за вучобу.

У 16 год Нікалай скончыў гандлёвую школу, атрымаў сярэднюю асвету. Але нікуды на работу яго не прымалі. І Нікалай, маючы спецыяльную адукацыю, вымушан ісці працаваць чорнарабочым на півварню разам з бацькам. Піліў дошкі на скрынкі для піва, працаваў па 14 гадзін у дзень, а зарабляў паўтара злотых. І такая работа была толькі летам, а зімой ён станавіўся ў мыечнай — мыў бутэлькі. Чатыры годы адпрацаваў у вільготнай мыечнай.

Скора падаспела вайна з Германіяй. Не ўстаяла гнілая польская дзяржава, пакінулі незадачлівыя правіцелі сваю аграбленую краіну і народ. Руку дапамогі падаў брацкі совецкі народ. На піваварні рабочыя ўстанавілі строгі кантроль профсаюза, каб не даць капіталістам разбазарыць каштоўнасці. Нікалая Багнюка рабочыя выбралі намеснікам старшыні і сакратаром профарганізацыі.

Тав. Багнюка вылучылі майстрам, а потым паслалі на курсы дырэктараў магазінаў пры горхарчпромгандлі. А ў маі, калі ён на «выдатна» закончыў вучобу, накіравалі на пасаду дырэктара пасудна-гаспадарчага магазіна № 97. Магазін вялікі, у ім працуе 13 работнікаў. На рабоце Багнюк праявіў вялікія арганізатарскія здольнасці. Як стаханаўца гандлю; дырэкцыя горхарчпромгандлю прэміравала яго каштоўнай прэміяй.

Аб сваім вылучэнні на работу дырэктара магазіна тав. Багнюк гаворыць:

— Я шэсць год адпрацаваў на піваварні ў капіталістаў, працаваў па 14—16 гадзін у суткі, а ніхто не сказаў мне добрага слова. А зараз і года не працую, а атрымаў ужо і прэмію, і пачотам карыстаюся. Але найвялікшая для мяне чэсць гэта тое, што мяне, маладога, сына простага рабочага, вылучылі зараз кандыдатам у мясцовы орган совецкай улады. Я аддам усе сілы на тое, каб апраўдаць вялікае давер'е народа, буду чэсна працаваць на дабро соцыялістычнай радзімы.

Вера Іванаўна Ражко

Рана пазнала нястачу і цяжкую працу Вера Ражко. З 12 год пайшла працаваць прыслугай да фабрыканта Фінкельштэйна. Многа прышлося перанесці здзекаў. Пасля паступіла працаваць на дайлідскі фанерны завод. На заводзе Веру Іванаўну прымушалі ўступіць у фашысцкую арганізацыю «Стральцоў». Яна катэгарычна адмовілася, за гэта яе выкінулі з завода. Затым працуе прысучальшчыцай на тэкстыльнай фабрыцы Пікуса, але не больш 5-х месяцаў у год. У верасні 1939 года, як толькі стала вядома аб прыходзе Чырвонай Арміі, група рабочых і работніц разам з тав. Ражко вышлі з кветкамі за 7 кіламетраў ад горада, каб сустрэць часці гераічнай Чырвонай Арміі. Больш двух сутак яны чакалі яе прыходу.

Цяпер Вера Іванаўна — стаханаўка 6-га тэкстыльнага камбіната. Яна першай перайшла на ўшчыльненую работу — удвух абслугоўваюць адзін сельфактар. У першыя дні яе пераходу на ўшчыльненую работу некаторыя рабочыя гаварылі:

— Гэта не цяжка—працаваць на сельфактары з 478 верацёнамі. Вось няхай паспрабуе працаваць на вялікім сельфактары.

Тав. Ражко перайшла працаваць на сельфактары з 520 верацёнамі. Вытворчае заданне яна не толькі выконвала, але і перавыконвала. Усе астатнія работніцы пераканаліся ў мэтазгоднасці пераходу на ўшчыльненую работу.

За год совецкай улады карэнным чынам палепшаны ўмовы працы на прадпрыемствах.

— Раней, пры фабрыкантах, — гаворыць тав. Ражко — у час работы зімой замярзалі рукі. Цяпер цэхі добра агледжаны, ацеплены, працаваць стала прыемна і весела. Узрасла заработная плата. Работніца-прысучальшчыца зарабляе звыш 400 рублёў у месяц. Цяпер адчуваеш сябе поўнапраўным грамадзянінам.

Як лепшую з лепшых работніц, калектыў 6-га тэкстыльнага камбіната вылучыў Веру Іванаўну Ражко кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета дэпутатаў працоўных па 112-й выбарчай акрузе.

Лейб Беркавіч Грабоўскі

Нарадзіўся ён у 1920 годзе ў сям'і беластоцкага рабочага-гарбара. Вучыцца многа не давялося — у сям'і не было для гэтага сродкаў. Бацька працаваў усяго 4 месяцы ў год. Скора Лейб стаў сам шукаць работу, але гэта было нялёгкай справай. Паступіў вучнем у прыватную рамесленую школу. За вучобу трэба было плаціць 15 злотых у месяц і працаваць на выкананні заказаў, якія прымала школа. У 1939 годзе ён заканчвае школу і паступае токарам на завод Готліба. Працаваць прыходзілася ў жудасных умовах: механічны цэх быў зусім неабсталяваны, нават не было падлогі. Зімой завод не апальваўся, працавалі на марозе.

Совецкая ўлада зрабіла завод дзяржаўным. Інакш пайшлі справы У гэтым годзе праведзена рэканструкцыя і рамонт усіх цэхаў механічнага завода № 35. Працаваць стала ўтульна і прыемна. Колькасць рабочых узрасла з 60 чалавек да 200 з лішнім.

— Цяпер, — гаворыць тав. Грабоўскі, — мы ведаем, што працуем не на капіталістаў, а на дабро народа, на сваю соцыялістычную дзяржаву. Праца стала пачотным абавязкам. Назаўсёды знікла няўпэўненасць у заўтрашнім дні. Як і кожны рабочы, я ўпэўнен, што заўсёды атрымаю работу. Усё гэта надае радасць, бадзёрасць, весялосць у жыцці. Цяпер вось працую на двух станках—стругальным і фрэзерным. Вучуся ў стаханаўскай школе. Вытворчыя заданні выконваю на 150—160 процантаў. Многа чытаю тэхнічнай літаратуры, вывучаю «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», асобныя творы Леніна і Сталіна. Палітычна расту. Настойліва авалодваю тэхнічнымі ведамі.

Калектыў рабочых і служачых 35-га механічнага завода аднадушна вылучыў Лейбу Беркавіча Грабоўскага кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета дэпутатаў працоўных па 34-й выбарчай акрузе. Тав. Грабоўскі — дастойны прадстаўнік нашай свабоднай моладзі.

Апалінарыя Васільеўна Цітова

Яна равесніца совецкай краіны, ёй усяго 23 годы. Але за яе спіной вялікі шлях вучобы і працы. Яна дачка чыгуначніка, нарадзілася на станцыі Дзедавічы, Ленінскай чыгункі. У 1932 годзе скончыла сямігодку, пайшла на курсы тэлеграфістаў. Пасля вучобы тав. Цітова ўвесь час працуе ў Маскве ва ўпраўленні Ленінскай чыгункі тэлеграфісткай. Тут уступіла ў комсамол, тут вырасла палітычна, набыла вялікі грамадскі вопыт.

У канцы мінулага года тав. Цітова была паслана комсамолам на работу ў Беласток. Калі яна прыехала працаваць у чыгуначны тэлеграф, тэлеграфісткі спачатку здзіўляліся — адкуль у маладой совецкай дзяўчыны столькі ведаў і вопыту, чаму яна такая смелая і з усімі запроста гаворыць аб любых справах.

— У нас,—адказала Цітова, — кожнага чалавека выхоўвае совецкая ўлада, вучыць і ўзнімае да грамадскага жыцця. Кожны ў нас свабодны чалавек, нічым не скован, мае ўсё для свайго развіцця, толькі сам старайся працаваць добра, не бойся часовых цяжкасцей!

І дзяўчаты, раней забітыя праклятым капіталістычным ладам, скора зразумелі і адчулі самі праўду слоў іх новай сяброўкі. Тав. Цітова аддавала масава-выхаваўчай рабоце кожную мінуту свабоднага часу. Яна арганізавала спачатку харавы гурток, які потым вырас у вялікі ансамбль. Яна стала вывучаць з дзяўчатамі Сталінскую Канстытуцыю, прывівала соцыялістычныя адносіны да працы.

Палітаддзел ацаніў добрую работу комсамолкі Цітовай і ўзяў на работу ў палітаддзел. Зараз яна—памочнік начальніка палітаддзела Беластоцкага аддзялення па комсамольскай рабоце. Гэта вялікая і адказная работа, якую любіць тав. Цітова і якой аддае ўсю душу. За добрую работу палітаддзел прадставіў тав. Цітову да наркомаўскай узнагароды.

Яе дастойна ацаніў народ. Сход калектыва першай дыстанцыі сувязі вылучыў тав. Цітову сваім кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета дэпутатаў працоўных. На ўсіх сходах выбаршчыкаў кандыдатура дастойнай дачкі совецкага народа падтрымана аднадушна.

Падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы

СУСТРЭЧА КАНДЫДАТА З ВЫБАРШЧЫКАМІ Ў ГУРТКУ

На кватэры рабочага па вуліцы Яснай у Беластоку займаецца гурток, якім кіруе агітатар-камсамолка тав. Казак. Аднойчы на заняткі гуртка прышоў кандыдат у дэпутаты горсовета па 149 выбарчай акрузе тав. Шварц. Ніколі пры польскай уладзе не здаралася, каб кандыдат сам прыходзіў да рабочых на кватэру, знаёміўся з імі, расказваў аб сабе і распытваў выбаршчыкаў аб іх жыцці, цікавіўся іх запытаннямі.

Выбаршчыкі добра ведаюць тав. Шварца. Ён нарадзіўся і жыў тут, сярод вузкіх вулічак, з жыццё яго было жыццём сапраўднага змагара-рэвалюцыянера за справу рабочага класа.

Шолам Янкелевіч Шварц нарадзіўся ў 1901 годзе ў сям'і рабочага. З 12 год ён пайшоў на работу ў пякарню, а затым працаваў чорнарабочым. У 1917 годзе паступіў у маслабойню. Тут ён пачынае сваю рэвалюцыйную дзейнасць у прафсаюзах. Кіруе забастоўкамі рабочых-харчавікоў. У 1922 годзе ўступае ў комуністычную партыю Польшчы. У хуткім часе быў вылучан сакратаром ячэйкі харчавікоў, адначасова выбіраецца членам беластоцкага гаркома партыі, а пасля—членам беластоцкага акруговага камітэта партыі. У 1925 годзе тав. Шварц удзельнічае ў IV канферэнцыі КПП і III канферэнцыі КПЗБ, на якой быў выбран членам ЦК КПЗБ.

У 1926 годзе т. Шварц працуе сакратаром Віленскага акруговага камітэта партыі. На гэтай рабоце яго арыштоўваюць. Але турма і цяжкія здзекі не зламілі сілу тав. Шварца. Ён працягвае барацьбу ў новых умовах, арганізоўвае выступленні і галадоўкі палітзняволеных. 2 гады праседзеў Шварц да суда. Суд прыгаварыў яго да 10 год турмы. 10 год падрад прасядзеў Шолам Янкелевіч у розных турмах Польшчы. У 1936 годзе, калі ён вышаў на свабоду, зноў ідзе ў першых радах барацьбы рабочага класа. Працуе сакратаром Беластоцкага акруговага камітэта партыі. 1937 год—зноў арышт і высылка ў канцэнтрацыйны лагер Картуз-Бяроза. Пасля 14 месяцаў турмы Шварц на свабодзе і паступае працаваць на маслазавод.

У памятны дзень—22 верасня 1939 г., калі Чырвоная Армія ўступіла ў Беласток, Шварц арганізоўвае вялікі мітынг працоўных горада, на якім заклікае дапамагчы Чырвонай Арміі ачысціць горад ад усякай контррэвалюцыі. Тав. Шварц прымае актыўны ўдзел у арганізацыі рабочай гвардыі і выбараў у Народнае Сабранне.

Пасля ўстанаўлення Советскай улады ў Беластоку яго вылучаюць на кіруючую работу на маслазавод. У цяперашні час Шолам Янкелевіч працуе начальнікам цэха на маслазаводзе, з'яўляецца ініцыятарам стаханаўскага руху. Ён кіруе таксама масава-палітычнай работай заўкома.

Рабочыя маслазавода вылучылі яго кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета па 149 выбарчай акрузе. Усё мінулае Шолама Янкелевіча Шварца і цяперашняе яго жыццё з'яўляецца залогам, што ён давер'е выбаршчыкаў поўнасцю апраўдае.

А. Суравіч.

АГІТМАСАВАЯ РАБОТА Ў ДАМБРОЎСКІМ РАЁНЕ

Працоўныя Дамброўскага раёна сустракаюць дзень выбараў з найвялікшай палітычнай актыўнасцю.

1.756 лепшых прадстаўнікоў вызвалення народа працуюць у выбарчых камісіях. Гэты выдатны актыў па-бальшавіцку ўключыўся ў выбарчую кампанію. Старанна ўпрыгожаны і аформлены памяшканні выбарчых участкаў.

Выбаршчыкі раёна на сваіх сходах вылучылі 405 чалавек кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых органаў дзяржаўнай улады. Гэта лепшыя сыны і дочкі народа, да канца адданыя справе нашай партыі, справе соцыялізма.

У раёне зараз працуюць 33 агіткалектывы, якія яднаюць 541 чалавека агітатараў. На выбарчых участках працуюць 348 гурткоў, якімі ахоплена 15.213 выбаршчыкаў.

Асобныя агітатары і агіткалектывы ў цэлым паказваюць сапраўдныя ўзоры бальшавіцкай агітацыі. Так, агіткалектыў Сухавольскага пасялковага Совета правёў вялікую работу сярод выбаршчыкаў. Арганізаван 51 гурток па вывучэнню Канстытуцыі СССР і Палажэння аб выбарах. У гуртках займаецца 1.500 выбаршчыкаў.

Пераважная большасць агітатараў з пачуццём велізарнай адказнасці адносіцца да даручанай ім пачотнай справы. Агітатар-настаўніца тав. Фалевіч правяла ў сваім гуртку 9 заняткаў па вывучэнню Канстытуцыі СССР і БССР, выбарчага закона. Яна з сваімі выбаршчыкамі вывучыла даклад тав. Калініна аб XXIII гадавіне советскай улады, знаёміць іх з міжнародным становішчам. Заняткі праходзяць жыва і цікава. Тое-ж самае можна сказаць і пра агітатараў тт. Паляву і Мядзведзеву. Яны глыбока і змястоўна растлумачваюць выбаршчыкам на занятках гуртка матэрыялы, звязаныя з выбарчай кампаніяй, знаёмяць іх з грамадска-палітычнай дзейнасцю кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Советаў.

Вялікую работу праводзіць з выбаршчыкамі агітатар Стараходараўскай выбарчай акругі № 31 тав. Пчэлкоўская. Яна на польскай мове прачытала для выбаршчыкаў два даклады. Некалькі дакладаў было прачытана на тэму: «Ленін і Сталін у дні Кастрычніцкай рэвалюцыі». На міжнародных пытаннях праведзена 10 гутарак. Яна таксама расказала выбаршчыкам пра творчасць вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча.

У агітацыйна-прапагандысцкай рабоце прымяняюцца разнастайныя формы. Зараз практыкуецца праведзенне сходаў і гутарак са старымі, жанчынамі і моладдзю. Для моладзі, якая ўпершыню прымае ўдзел у галасаванні, прачытана 15 дакладаў на тэму «Сталінская Канстытуцыя і моладзь».

Цяпер разгортваецца адказнейшы этап выбарчай кампаніі — агітацыя за вылучаных кандыдатаў у дэпутаты. У правядзенні гэтай работы выключную ролю адыгрываюць даверанныя асобы. Даверанныя на сходах, на занятках гуртка, індывідуальных гутарках знаёмяць выбаршчыкаў з біяграфіямі кандыдатаў, іх грамадска-палітычнай дзейнасцю. Райком КП(б)Б дапамагае ў рабоце даверанных асоб, праводзіць з імі семінары па абмену вопытам работы. Большасць кандыдатаў у дэпутаты раённага Совета ўжо сустрэлася з сваімі выбаршчыкамі.

На Новадворскім, Дамброўскім і іншых выбарчых участках рэгулярна выходзяць насценныя газеты. Яны на сваіх старонках паказваюць работу агітатараў, перадаюць вопыт работы даверанных.

У правядзенні рабоце па падрыхтоўцы да выбараў ёсць рад істотных недахопаў. У нас яшчэ на асобных участках пастаўлена слаба агітацыйна-масавая работа з выбаршчыкамі. Райком партыі прымае дзейсныя меры, каб хутчэй ліквідаваць гэтыя недахопы. Няма сумнення, што працоўныя Дамброўскага раёна ў дзень выбараў усе як адзін з'явяцца на выбарчыя ўчасткі і сваім аднадушным галасаваннем прадэманструюць бязмежную любоў да вялікай партыі Леніна—Сталіна, аддадуць свае галасы за магутны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных.

А. Крушынскі,
загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Дамброўскага райкома КП(б)Б.

ВЫСТАЎКА У ДАПАМОГУ АГІТАТАРАМ

ГРАЕВА. (Ад нашага карэспандэнта). Аддзел агітацыі і прапаганды райкома партыі ў дапамогу агітатарам і прапагандыстам арганізаваў раённую выстаўку. На выстаўцы шырока прадстаўлены матэрыялы аб дасягненнях краіны соцыялізма за 23 годы советскай улады.

В. Г.

На здымку: знешні выгляд памяшкання выбарчага ўчастка № 7 на вуліцы Чкалава ў Беластоку.

Фота А. Сапіра.

Комсамольцы аднаго калгаса

XVIII з'езд ВКП(б) у сваіх рашэннях запісаў, што «комсамольскія арганізацыі маюць права шырокай ініцыятывы ў абмеркаванні і пастаноўцы перад адпаведнымі арганізацыямі ўсіх пытанняў работы прадпрыемства, калгаса, саўгаса, установы, звязаных з задачамі ўстаранення недахопаў у дзейнасці апошніх і аказання ім неабходнай дапамогі ў паляпшэнні работы шляхам арганізацыі соцыялістычнага спаборніцтва, ударніцтва, праведзення масавых кампаній і т. д.».

Вялікае поле дзейнасці ў сувязі з рашэннямі XVIII партыйнага з'езда прадастаўлена калгасным комсамольскім арганізацыям. Яны павінны ўглыбляцца ва ўсе пытанні гаспадарчай дзейнасці калгаса, дапамагаць праўленню калгаса ва ўмацаванні працоўнай дысцыпліны, у барацьбе за высокі ўраджай, за развіццё грамадскай гаспадаркі калгаса.

Комсамольская арганізацыя калгаса «Парыжская Комуна», Індурскага сельсовета, Гродненскага раёна, правільна зразумела свае задачы па вырашэнню гаспадарчых і дзяржаўных пытанняў работы калгаса. У час правядзення першай калгаснай вясенняй сяўбы комсамольцы арганізавалі збор і рамонт сельскагаспадарчага інвентару, ачышчалі насенне для пасеву, збіралі попел на ўгнаенне. На палявых работах комсамольцы былі ўперадзе, выконвалі дзённыя нормы выпрацоўкі на 180—200 процантаў. Сваю ўдарную работу на полі комсамольцы спалучалі з масавай работай, у поле праводзілі чытку газет, раз'яснялі калгаснікам рашэнні партыі і совецкага ўрада, агітавалі словам і справай за хутчэйшае скончэнне сяўбы. Асаблівa праявілі сябе ў час вясенняй пасяўной комсамольцы Нікалай і Уладзімір Смолка.

Перад пачаткам уборкі ўраджаю комсамольцы сабралі сход моладзі, запрасілі старшыню калгаса для справаздачы аб гатоўнасці калгаса да ўборкі. Тут-жа пастанавілі арганізаваць комсамольска-маладзёжнае звяно па ўборцы ўраджаю. Кіраваў звяном Уладзімір Смолка. Комсамольцы аказаліся ўперадзе, выконвалі норму выпрацоўкі ўдвая і больш, зарабляючы па 6 працадзён у дзень. Уборку зерневых калгас скончыў за 7 дзён, другім у раёне калгас разлічыўся з дзяржавай па зернапастаўках.

Добра папрацавалі комсамольцы і на дарожным будаўніцтве. Комсамольска-маладзёжная брыгада сістэматычна перавыконвала нормы выпрацоўкі на дарожным будаўніцтве, за што атрымала прэмію. Былі прэміраваны комсамольцы Уладзімір Смолка, Міхаіл Юшкевіч і іншыя.

Па ініцыятыве комсамольцаў калгас правёў сіласаванне кармоў у колькасці 20 тон. Стары калгаснікі баяліся такой «зацеі». Але комсамольская настойлівасць перамагла і ў гэтай справе.

Усебакова развіваць і пашыраць грамадскую гаспадарку калгаса — такі дэвіз комсамольцаў. Яны раз'яснілі калгаснікам важнасць развіцця грамадскага садоўніцтва. Калгаснікі падтрымалі комсамольцаў, і калгас пасадзіў два гектары маладога саду.

У калгасе не было прасторных будынкаў для масавых сходаў, і вось комсамольцы высоўваюць праланову пабудаваць калгасны клуб, дзе можна праводзіць усю палітычна-масавую работу, чытаць кнігі і газеты, слухаць радыё, наладжваць лекцыі. Ініцыятыву комсамольцаў падтрымалі ўсе калгаснікі, і клуб пабудаван. Зараз ідзе ўнутранае афармленне яго, набываюцца літаратура, плакаты, партрэты, збіраюцца купіць радыёпрыёмнік.

Вялікую работу праводзяць у калгасе добраахвотныя таварыствы, якімі кіруюць комсамольцы. Арганізацыя Асоавіяхіма, старшынёй якой з'яўляецца комсамолец Міхаіл Юшкевіч, налічвае 47 членаў. Усе яны ўжо здалі нормы на значок «Гатоў да проціпаветранай і хімічнай абароны» першай ступені. Арганізацыя МОПР'а, старшынёй якой з'яўляецца комсамолец Нікалай Смолка, налічвае 38 членаў. Праведзена 6 гутарак па інтэрнацыянальнаму выхаванню, праведзен збор сродкаў у дапамогу вязням капітала.

Комсамольцаў калгаса ведаюць не толькі калгаснікі сельгасарцелі «Парыжская Комуна». Яшчэ да прыходу Чырвонай Арміі многія з іх былі рэвалюцыйнымі агітатарамі сярод сялян навакольных вёсак. Яны разносілі лістоўкі па вёсках, вялі падпольную агітацыю, расказвалі аб Советскім Саюзе. 18-гадовым юнаком Аляксей Смолка трапіў у турму. А цяпер тав. Смолка кіруе комсамольскай арганізацыяй у калгасе.

Тром комсамольцам — Аляксею Смолка, Уладзіміру Смолка і Серафіме Юшкевіч калгаснікі і сяляне аказалі вялікае давер'е, вылучыўшы кандыдатамі ў сельскі Совет дэпутатаў працоўных. Комсамольцы вядуць на кіруючай рабоце ў сельсовеце і калгасе. Аляксей Смолка зараз вылучан старшынёй Стара-Дубаўскага сельсовета, Уладзімір Смолка выбран намеснікам старшыні калгаса, і Нікалай Смолка — брыгадзірам калгаса. За кароткі час Нікалай Смолка здолеў наладзіць правільны ўлік працы ў калгасе і арганізацыю працы ў брыгадзе.

Праўленне калгаса і калгаснікі раяцца з комсамольцамі па пытаннях далейшага развіцця грамадскай гаспадаркі калгаса. Вечарамі ў доме Аляксея Смолка збіраюцца комсамольцы, моладзь і пажылыя калгаснікі. Яны прыходзяць пачуць навіны з газет, пагутарыць аб справах калгаса, намеціць далейшыя перспектывы развіцця калгаса. А перспектывы вялікія! У 1941 годзе намячаецца павелічэнне пагалоўя буйной рагатай жывёлы ў тры разы, значнае расшырэнне свінафермы, стварэнне аўцагадоўчай фермы. Зараз калгаснікі пачалі будаўніцтва памяшкання для жывёлы. Вясной 1941 года намячаецца ў два разы павялічыць калгасную пасеку — калгас будзе мець 28 вулляў пчол.

Па прапанове комсамольцаў калгаснікі рашылі пабудаваць калгасны вадаём. З стварэннем вадаёма ў калгасе будзе вырашана праблема гародніцтва—будзе блізка вада для палівкі. Акрамя таго пабудова вадаёма дасць магчымасць арганізаваць рыбную гаспадарку.

Задача комсамольскай арганізацыі—усямерна падтрымліваць калгаснікаў у далейшым развіцці грамадскай гаспадаркі калгаса, быць ініцыятарамі арганізацыі соцыялістычнага спаборніцтва, дабівацца павышэння прадукцыйнасці працы.

Д. Ніціфарэнка,
загадчык аддзелам сялянскай моладзі Беластоцкага абкома ЛКСМБ.

На здымку: падмайстар-вылучэнец беластоцкай плюшавай фабрыкі № 31 А. Б. Іцкоўскі. Тав. Іцкоўскі абслугоўвае 38 станкоў і выконвае норму выпрацоўкі на 107,5 процанта.

Фота А. Сапіра.

У АБКОМЕ КОМСАМОЛА

Бюро абкома комсамола днямі заслухала на сваім пасяджэнні сакратара Бранскага райкома комсамола тав. Клімчэню аб удзеле комсамольскай арганізацыі ў выбарчай кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Комсамольская арганізацыя Бранскага раёна нездавальняюча выконвае рашэнне ЦК і абкома ЛКСМБ аб удзеле комсамольскіх арганізацый у правядзенні выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Гэту важнейшую работу Бранскі райком комсамола пусціў на самацёк. Агітацыйна-масавая работа на выбарчых участках праводзіцца неарганізавана і носіць выпадковы характар. Райком зацвердзіў 90 комсамольцаў агітатарамі, аднак шэраг з іх работы з імі не праводзіць. У выніку большасць агітатараў (Каўзановіч, Любаноўская, Чаўлытка, Гаварушка і іншыя) яшчэ не пачалі работу з насельніцтвам. Не прыступілі да работы створаныя тры комсамольска-маладзёжныя агіткалектывы.

Зусім слаба разгорнута агітацыя за вылучаных кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Советаў; вялікая частка выбаршчыкаў не ахоплена вывучэннем выбарчага закона, даклады і гутаркі праводзяцца рэдка.

Пастаянныя камісіі пры райкоме, і ў першую чаргу камісіі па прапагандзе і агітацыі і культурна-масавая камісія, бяздзейнічаюць. Комсамольская арганізацыя не аказвае ўчастковым выбарчым камісіям у наладжванні работы на ўчастках, не ўсе выбарчыя ўчасткі абсталяваны. На ўчастку № 7 (пасёлішча Рудкі) брудна, на падлозе валяецца папера, памяшканне не абагравецца. 10-ы ўчастак (Бранск) павет не мае свайго памяшкання, няма дзяжурства. На ўчастку прапупшчана 112 выбаршчыкаў, перабытаны асобныя прозвішчы і іншыя даныя аб выбаршчыках.

Райком комсамола дрэнна прыцягвае моладзь, школьнікаў, піонераў да работы на выбарчых участках. Арганізаваныя дзіцячыя калектывы мастацкай самадзейнасці на выбарчых участках не выступаюць.

Бюро абкома комсамола прапанавала Бранскаму райкому прыняць усе меры да забеспячэння выканання рашэння ЦК і абкома ЛКСМБ аб удзеле комсамола ў выбарчай кампаніі. Забяспечыць кіраўніцтва і контроль за работай агітатараў, смялей прыцягваць да работы на выбарчых участках моладзь, піонераў і школьнікаў, ахапіць усіх выбаршчыкаў групавой і індывідуальнай агітацыяй, наладзіць работу камісій райкома і ў першую чаргу камісіі па прапагандзе і агітацыі і культурна-масавай рабоце, шырэй разгарнуць агітацыю за выстаўленых кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Райкому ЛКСМБ прапанавана арганізаваць работу раённага Дома соцыялістычнай культуры і хатчыталень, практыкаваць правядзенне вечароў сустрэч з дэпутатамі Вярхоўных Советаў і кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Советаў дэпутатаў працоўных, праводзіць вечароў мастацкай самадзейнасці, гутарак і дакладаў. Прыцягнуць да работы ўвесь комсамольскі актыў, моладзь і сельскую інтэлігенцыю, звярнуць асаблівую ўвагу на работу хат-чытален і пастаноўку агітацыйнай работы ў аддаленых населеных пунктах.

Абком ЛКСМБ звярнуў увагу ўсіх райкомаў і гаркомаў комсамола на павышэнне бальшавіцкай пільнасці кожнага комсамольца і яго авангарднай ролі ў правядзенні выбарчай кампаніі. Мабілізаваць усе свае сілы на аказанне канкрэтнай дапамогі партыйным арганізацыям у бальшавіцкім правядзенні выбарчай кампаніі, каб дабіцца 100-процантнай яўкі на ўчасткі і аднадушнага галасавання за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Перадавая роля комсамольцаў

Ва ўсіх галінах гаспадарчага, культурнага, грамадска-палітычнага жыцця моладзь Скідзельскага раёна праяўляе вялікую актыўнасць. Тыя, хто пры польскім панаванні не меў перад сабой ніякай перспектывы, не меў работы, не мог атрымаць асветы, зараз паказваюць узоры соцыялістычных адносін да працы. Малады юнак мястэчка Скідзель М. Лайт раней не мог атрымаць работы, праследаваўся польскай паліцыяй за спачуванне комуністам. А зараз тав. Лайт вылучан на работу дырэктара электрастанцыі. Ён добра спраўляецца з гэтай работай, актыўна ўдзельнічае ў грамадскай рабоце, выбран старшынёй райкома МОПР'а. Тав Лайт прыняты ў члены комсамола.

Нікапор Улейка, які вызвален з польскай турмы Чырвонай Арміяй, працуе сакратаром Скідзельскага пасялковага Совета, зараз вылучан кандыдатам у дэпутаты раённага Совета дэпутатаў працоўных.

Маладыя патрыёты праявілі сваю ініцыятыву ў добраўпарадкаванні мястэчка. Муля Мурштэйн і Лейзар Паляк самі добра працавалі на пабудове шасейнай дарогі і актыўна ўдзельнічалі ў мабілізацыі мас на хутчэйшае скончэнне будаўніцтва. Добра папрацавалі маладыя калгаснікі калгаса ім. Варашылава, Лаўненскага сельсовета, на пабудове калгаснага вадаёма. Комсамольцы калгаса імені 17 верасня прапанавалі пасадзіць калгасны сад і самі прынялі актыўны ўдзел у рабоце. Іх ініцыятыву падхапілі комсамольцы і моладзь іншых калгасаў, у выніку па раёну за гэту восень пасаджана 73 гектары садоў у калгасах.

Зараз моладзь актыўна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Добра працуюць агітатары: комсамолка з вёскі Загараны Ліда Паўшок, вылучаная кандыдатам у раённы Совет; толькі што прынятая ў комсамол маладая настаўніца вёскі Жытомля тав. Драчова, Муля Мурштэйн з мястэчка Лунна, малады калгаснік калгаса імені Тэльмана комсамолец Антон Шулеўскі. Актыўна вядзе агітацыйную работу сын бедняка з вёскі Мізава Ільля Крой. Нядаўна яго прынялі ў комсамол.

Комсамольцы і моладзь калгаса імені 17 верасня падрыхтавалі мастацкую самадзейнасць, з якой выступалі на выбарчым участку. Кіруе гуртком самадзейнасці комсамолец з вёскі Пыра тав. Хомка. Такую-ж самадзейнасць арганізавалі комсамольцы разам з моладдзю ў калгасах імені Молатава, імені Калініна і іншых калгасах і вёсках.

Усе комсамольцы і лепшая моладзь Скідзельскага раёна актыўна ўдзельнічаюць у выбарчай кампаніі, робяць усё, каб забяспечыць поспех выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Ф. Аўчыннікаў,
сакратар Скідзельскага райкома комсамола.

У БЛАКНОТ АГІТАТАРУ

Перадвыбарчы тэрор у былой панскай польшчы

У 1923 годзе я была кандыдатам у дэпутаты гарадской думы ў г. Лодзі. Спісак «Саюза пралетарыята горадоў і вёсак» згуртаваў вакол сябе рад вядомых дзеячоў — з ліку рабочых, урачоў, настаўнікаў. Я тады працавала ў паўпэхнай школе і там-жа была вылучана кандыдатам у гарадскую думу. У нашай праграме, якую мы ў вялікай колькасці расклеілі па гораду, мы патрабавалі перанясення падатковага цяжару на багацеяў, барацьбы з дарагоўляй, будаўніцтва жылых дамоў для рабочых, упарадкавання рабочых кварталаў шляхам правядзення каналізацыі, электрычнасці і трамвайных ліній, арганізацыі бальніц і т. п. Наша агітацыя карысталася вялікім поспехам сярод рабочых. Мы выступалі на мітынгах на польскай, яўрэйскай і нямецкай мовах. Рабочыя і саматужнікі сустракалі нас вельмі цёпла.

Да выбараў аставалася толькі два дні. Напружана мы рыхтаваліся да рашучага дня. Памятаю, як сёння: у цёмнай хаце рабочага, пры цьмяным святле карасінавай лямпы, паціхеньку, каб не пачуў нас вораг, мы атрымлівалі інструкцыі.

Мы расталіся поўныя надзеі на выкананне намечаных планаў.

Ноччу я пачула моцны стук у дзверы. Запаліла лямпу і чакаю. Сталі яшчэ мацней стукаць:

— Прашу адчыніць, тэлеграма!— пачула голас.

— Пачакайце да раніцы, адказала я, — чужым ночку дзверы не адчыняю.

Азлобленыя паліцэйскія ўжо не маскіраваліся і сталі ламаць дзверы. Воляй-няволяй прышлося адчыніць. Пасля вобыску, які, зразумела, нічога не даў, мне заявілі, што я арыштавана.

Хутка я была ўжо ў лодзінскім сыскным аддзяленні разам з іншымі таварышамі, якія ўдзельнічалі ў выбарах. Наш спісак, як я потым даведалася, быў прызнан несапраўдным на аснове тэлеграмы міністэрства ўнутраных спраў. Тэлеграма з Варшавы прышла ў дзве гадзіны ночы, і зараз-жа нас адвезлі ў турму.

На наступны дзень мне прышлося «пазнаёміцца» з адным вышэйшым саноўнікам лодзінскага сыскнога аддзялення, з камісарам Вейерам. Калі ён у гутарцы са мной знеахвяжыў палітзняволеных, я яму коратка адказала:

— Хам!

За гэта мяне адправілі ў карцар на 48 гадзін.

Цёмны склеп, камера з замураваным акном, хлеб і вада. У іншых камерах сядзяць таварышы, пытаюць «хто?» Я яшчэ не навучылася стукаць, крычу праз сцяну. Неяк нам удаецца згаварыцца. Нейчыя клапатлівыя рукі перадаюць у камеру хлеб і яйка.

Пры слабым святле электрычнай лямпы я вырасала на сцяне выбарчы плакат. Маё прыладай была галачная булаўка. Вось змест плаката.

«Саюз пралетарыята гарадоў і вёсак!

Кандыдат спіска № 5

Марыя Эйгер

Дзень выбараў праводзіць у карцары»

Затым праз некалькі месяцаў — суд. За што? Спісак наш быў легальны, мітынгі праводзілі з дазволу паліцыі, але ўсё гэта не іграе ролі. Суд выконвае волю буржуазіі. Тэрорам душаць рабочы рух. Галоўны абвінавачваемы тав. Франц Ленчыцкі, які сядзеў 8 год у польскіх турмах, зноў прыгаваран да турэмнага зняволення. Усіх нас прыгаварваюць на 2—4 годы турмы. Я атрымала яшчэ дадатковы прыгавор за знявагу камісара Вейера...

Такой была «дэмакратыя» ў былой панскай Польшчы.

Марыя Эйгер.

У АПОШНЮЮ ГАДЗІНУ

ДЗЕЯННІ АНГЛІЙСКАЙ АВІЯЦЫІ

ЛОНДАН, 11 снежня. (ТАСС). Міністэрства авіяцыі паведамляе, што ў ноч на 11 снежня англійская авіяцыя зрабіла налёт на Заходнюю Германію і акупіраваныя ёю тэрыторыі, дзе падвергла бамбардыроўцы лініі чыгунак, электрастанцыі, аэрадромы і рачныя докі. Бамбардыроўцы падвергліся таксама докі і парты, размешчаныя на ўзбярэжжы праліва Ла-Манш. З гэтых аперацый не вярнуліся на свае базы 2 самалёты.

Германская авіяцыя бамбардыравала сёння раніцой адзін з пунктаў Усходняй Англіі. Разбураны некаторыя жылыя будынкі. Афяры нязначныя.

—о—

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЗАХОДНЯЙ ПУСТЫНІ

НЬЮ-ЙОРК, 11 снежня. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Асошыэйтэд Прэс, агульная колькасць узятых у палон англічанамі ў Заходняй пустыні італьянцаў перавышае 6 тысяч чалавек. Англічане захапілі таксама многа ваенных матэрыялаў.

—о—

ВАЙНА Ў АФРЫЦЫ

ЛОНДАН, 11 снежня. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, англійская авіяцыя падвергла бамбардыроўцы чыгунку Джыбуці—Адыс-Абеба ў раёне, які мяжуе з Французскім Сомалі. Мяркуюць, што чыгунцы прычынены сур'ёзныя пашкоджанні.

—о—

НАРУШЭННЕ ЗАМЕЖНЫМІ САМАЛЁТАМІ ЮГАСЛАЎСКАЙ ГРАНІЦЫ

БЕЛГРАД, 11 снежня. (ТАСС). Паводле паведамлення газеты «Врэме», учора 5 самалётаў невядомай нацыянальнай прыналежнасці двойчы нарушылі югаслаўскую граніцу, праляцеўшы над гарадамі Улцінь і Бар на вышыні 3 тысяч метраў.

—о—

ЗАТРЫМАННЕ ЯПОНЦАМІ ГРЭЧАСКАГА ПАРАХОДА

ШАНХАЙ, 11 снежня. (ТАСС). Як паведамляе газета «Сіньвеньбао», 9 снежня ля вострава Хайнань японцы затрымалі грэчаскі параход, які ішоў з грузам вугалю з Ганконга ў Інда-Кітай. У шляху ён атрымаў пашкоджанне і быў вымушан зайсці ў адзін з партоў вострава для рамонту, дзе нечакана быў затрыман японскімі марскімі ўладамі.

—о—

ЗАЯВА БАТЛЕРА АБ АНГЛІЙСКАЙ ПАЗЫЦЫ КІТАЮ

ЛОНДАН, 11 снежня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, намеснік міністра замежных спраў Батлер паведаміў учора ў палаце абшчын, што англійскі ўрад згадзіўся ў прынцыпе прадаставіць Кітаю пазыку ў суме 10 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. Батлер заявіў, што з гэтай сумы 5 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў будзе перадана ў стабілізацыйны фонд Кітая, а астатнія 5 мільёнаў Кітай можа выкарыстаць для закупак тавараў у краінах, якія ўваходзяць у стэрлінгавы блок. Батлер дадаў, што англійскі ўрад вымушан быў зрабіць гэту агаворку, каб захаваць за сабой запасы золата і амерыканскай валюты для закупак ваенных матэрыялаў.

Прамова Гітлера

БЕРЛІН, 10 снежня. (ТАСС). Сёння на сходзе, які адбыўся на адным з ваенных прадпрыемстваў у Берліне, выступіў з прамовай германскі рэйхсканцлер Гітлер. На сходзе прысутнічалі: рэйхсмаршал Герынг, кіраўнік вярхоўнага камандавання ўзброеных сіл Германіі генерал-фельдмаршал Кейтэль, галоўнакамандуючы германскай арміяй генерал-фельдмаршал Браухіч, кіраўнік «Працоўнага фронта» Лей, адмірал Рэдэр, міністр прапаганды Гебельс і іншыя кіруючыя дзеячы Германіі.

Прамова Гітлера была прысвечана, галоўным чынам, пытанням унутранай палітыкі.

Закранаючы пытанне аб прычынах цяперашняй вайны, Гітлер прывёў лічбы, якія паказваюць суадносіны насельніцтва і тэрыторыі Англіі, Францыі, Германіі і Італіі, заявіўшы пры гэтым, што ён паставіў сваёй задачай ліквідацыю маючайся няроўнасці ў размеркаванні тэрыторыі, замацаванай Версальскім дагаворам.

Спыніўшыся на галоўных этапах вайны паміж Германіяй і Англіяй, Гітлер паведаміў, што страты Германіі забітымі ніжэй тых страт, якія Германія панесла ў час вайны супроць Францыі ў 1870—1871 г.г., а лік раненых таксама менш таго, што чакаўся.

Далей Гітлер адзначыў, што ў рэзультаце прарobленай работы па ўмацаванню ўзброеных сіл, а таксама стварэнню неабходных боепрыпасаў Германія ў цяперашні час гатова да ўсякіх выпадковасцей, «што-б Англія ні прадпрымала».

Гітлер заявіў, што Германія намерана наносіць усё больш моцныя ўдары па Англіі, а калі Англія «паспрабуе ўмацавацца дзе-небудзь на кантыненце, тады мы зноў з'явімся перад ёй!».

Далей Гітлер сказаў:

Ад нас залежыць вызначыць наступленне рашучай гадзіны. Я асцярожны ў гэтым. Германія, несумненна, вытрымае выпрабаванне гэтага часу і не будзе пераможана ні зброяй, ні часам, ні эканамічна.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 11 лістапада. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе, што з прычыны неспрыяючых метэаралагічных умоў дзейнасць германскай авіяцыі 10 і ў ноч на 11 снежня абмяжоўвалася разведчымі палётамі. Адзначаны пападанні бомб у партовыя збудаванні ў Крынтон-он-Сі, а таксама фабрычныя будынкі ў раёне паміж Фалкстонам і Кентэрберы. Ля Гарвіча атакавана гандлёвае судно. Дальнабойная артылерыя паспяхова абстраляла непрыяцельскія судны, якія спрабавалі ўвайсці ў Ла-Манш, і важныя ваенныя аб'екты ў раёне Дуўра.

У ноч на 11 снежня некалькі англійскіх бамбардыроўшчыкаў скінулі фугасныя і запальваючыя бомбы на акупіраваную тэрыторыю і Паўднёва-Заходнюю Германію. Урон нязначны. Збіта 2 непрыяцельскіх самалёты. Германская авіяцыя страт не мела.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 11 снежня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што 10 снежня адбылася артылерыйская дуэль паміж германскімі і англійскімі дальнабойнымі гарматамі праз Па-дэ-Кале.

Англійскія бамбардыроўшчыкі скінулі многа бомб на пазіцыі германскай артылерыі на мысе Гры Нэ. У раёне Дуўра германскімі самалётамі сур'ёзна пашкоджана некалькі дамоў. Сярод насельніцтва—3 раненых. Забітых няма.

Згодна камюніке міністэрства авіяцыі. дзеянні германскай авіяцыі ў ноч на 11 снежня насілі надта абмежаваны характар. Германскія самалёты над Лонданам не паяўляліся.

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

НЬЮ-ЙОРК, 11 снежня. (ТАСС). Агенцтва Асошыэйтэд Прэс паведамляе. што грэкі занялі новыя пазіцыі паблізу возера Охрыда, італьянцы адступаюць па напрамку да Хімара. Па звестках таго-ж агенцтва, днямі ў Дурацо высадзіліся 80 тысяч італьянцаў. Яны накіраваны на пазіцыі ўздоўж ракі Шкумба. Каля Гэпелене італьянцы ўстанаўляюць артылерыю і кулямёты. Не гледзячы на неспрыяючае надвор'е, англійскія самалёты бамбардыравалі Валону.

На паўночны захад ад Паградзеца грэкі разбілі апошнія ізаліраваныя атрады італьянцаў. На поўначы ад горада адбываюцца лютыя баі. Грэкі атакуюць італьянскія перадавыя пазіцыі ў гарах Мокра, каля возера Охрыда.

Каля Дэльвіне грэкі захапілі вялікую колькасць італьянскага ўзбраення. Па апошніх паведамленнях, італьянцы эвакуіруюць Гэпелене.

У Беластоцкім чыгуначным вучылішчы. Майстар механічнага цэха тав. Гарэлік Л. Б. растлумачвае вучням будову стругальнага станка.
Фота А. Сапіра.

Фестываль калгаснай музыкі і песні

Беларускі ансамбль песні і пляскі праводзіць фестываль музыкі і песні ў калгасах нашай вобласці.

З прыходам Чырвонай Арміі таленты з народа знайшлі прымяненне сваіх сіл, атрымалі магчымасці для росту і развіцця. І ў нашым ансамблі — работніцы з фабрык і заводаў, сялянскія хлопцы і студэнты — сталі артыстамі, упэўнена і горда ўзышлі на сцэну, аб якой пад панскай уладай маглі толькі сніць. І вось цяпер мы — дзеці працоўнага народа — нясем масам новае соцыялістычнае мастацтва. Гэта—першы фестываль музыкі на нашых вольных землях.

Праўда, і ў панскай Польшчы ў гарадах часам велізарнымі афішамі абвяшчалася аб фестывалях музыкі. Але гэта былі фестывалі толькі для багатых — для купца і фабрыканта, для дзяцей абшарнікаў, для гандляра і мешчаніна. Музыка гэтых фестываляў казытала нервы гарадскога буржуа, які шукаў чаго-небудзь вострага і пікантнага для свайго вуха і вока. Гэтыя фестывалі і іх музыка былі далёкімі ад народа.

Наш фестываль выкліча да творчага ўздыму новыя таленты з народных мас, накіруе іх на шлях соцыялістычнага мастацтва, на шлях творчай працы ў славу сваёй радзімы.

Успамінаюцца праклятыя часы, калі паліцэйскія разганялі канцэрты для селяніна і рабочага. Сяляне расказвалі, як «стшэльцы» і іншыя панскія прыхвастні грамілі і разбуралі пабудаваныя сялянамі сцэны, каб толькі не дапусціць беларускага канцэрта або спектакля. Год дзесяць таму назад у вёсцы Пясчанікі я трапіў у рукі панскай паліцыі разам са сваімі фальклорнымі запісамі. У час начнога вобыску ў вёсцы паліцэйскі знайшоў у адной хаце мае сшыткі з нотамі і тэкстамі народных песень. Я спаў у пуні на сене. З'явілася паліцыя, адабрала дакументы, арыштавала сялян, а ў пратаколе ў якасці «кампраметыруючых довадаў» падшыты былі народныя песні. Усе мы павінны былі ісці этапным парадкам у Беласток.

Калі сяляне пачалі гаварыць, што паліцыя ўжо саджае пад арышт нават народныя песні і аб гэтым могуць напісаць у газетах, тады паліцэйскі збянтэжаным тонам абвясціў мяне вар'ятам, бо каму-ж яшчэ, па яго думцы, патрэбна такое глупства, як народныя песні.

Толькі ў СССР умеюць любіць і цаніць народнае мастацтва, толькі ў СССР прадастаўляюцца магчымасці для росту і развіцця культуры.

Г. Шырма,
мастацкі кіраўнік беларускага ансамбля песні і пляскі.

Начны пераход комсамольскага атрада

Час ночы. Па сігналу трывогі 65 комсамольцаў сабраліся ва ўказаным месцы. Комсамольцы атрымліваюць процівагазы, вінтоўкі, раздаецца каманда: станавіся!

Дэсант «праціўніка» у колькасці адной роты высадзіўся каля вёскі Н. Па данясенню разведкі, «праціўнік» мае ручныя і станкавыя кулямёты, адну лёгкую гармату і вінтоўкі, умацоўваецца і заняў два паблізу ляжачых селішчы. У загадзе камандзіра атрада тав. Задоліна пастаўлена задача: дасягнуць вёскі Н. у 4 гадзіны 10 мінут раніцы.

Усё гатова, праверана снаражэнне, абутак, чутна чоткае камандаванне, і падраздзяленні комсамольцаў роўнымі радамі рушыліся ў «наступленне». Да вёскі Н. прышлі своечасова. Разведка данесла, што «праціўнік» у цэнтры вёскі на адпачынку, вёскі ахоўваюць толькі патрулі. Па камандзе комсамольцы рынуліся ў бой... Акружаная вёска з «праціўнікам» узята.

Роўна ў 5 гадзін раніцы ўдзельнікі паходу сабраліся ў памяшканні штаба «праціўніка», дзе падвялі вынікі начных заняткаў і дзеянні дробных падраздзяленняў у наступленні. Камандзір атрада тав. Задолін адзначыў, што 10-кілометровы пераход, зроблены комсамольцамі, прайшоў арганізавана. Адзначыліся на занятках падраздзяленняў тав. Луцкі і тав. Шунтукоў, якія ўмела фарсіравалі раку ўброд.

Л. Дубінін,
сакратар Сапоцкінскага райкома комсамола.

МАСТАЦКАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ У ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ

Актыўна ўдзельнічаюць гурткі мастацкай самадзейнасці горада Гродна і Гродненскага раёна ў падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Дом мастацкай самадзейнасці, арганізаваны дырэкцыяй парка культуры і адпачынку, аб'яднаў вакол сябе велізарны актыў. Акрамя хора народнай яўрэйскай песні (кіраўнік Р. Вігдаровіч) тут створан агульнагарадскі хор з 50 чалавек, драматычны калектыў, аркестр народных інструментаў, калектыў народнага танца, гурток мастацкай вышыўкі і т. д.

З удзельнікаў мастацкай самадзейнасці арганізаваны спецыяльныя канцэртна-эстрадныя брыгады, якія абслугоўваюць выбарчыя ўчасткі.

За месяц гурткамі мастацкай самадзейнасці прадпрыемстваў і школ горада дадзена каля 70 канцэртаў на выбарчых участках.

У работу па абслугоўванню выбаршчыкаў уключыліся і работнікі мастацтваў. Джаз-аркестр пад кіраўніцтвам тав. Каса, настаўніцкі калектыў музыкальнай школы (дырэктар тав. Каган) сістэматычна выступаюць у канцэртах для выбаршчыкаў.

Падрыхтоўка да выбараў ажывіла мастацкую самадзейнасць прадпрыемстваў і ўстаноў горада.

Драмкалектыў табачнай фабрыкі (кіраўнік т. Бакіновіч) паставіў п'есу Шкваркіна «Чужое дзіця» на польскай мове. Спектакль быў горача прыняты гледачамі. Зараз гэты калектыў рыхтуе спецыяльны вечар з твораў Адама Міцкевіча. Гарадскі драмкалектыў прыступіў да рэпетыцый п'есы А. Остроўскага «Без віны вінаватыя». Комсамольцы і моладзь вёскі Табол, Верцелішскага сельсовета, у перыяд падрыхтоўкі да выбараў стварылі харавы гурток у колькасці 30 чалавек. Танцавальны калектыў вёскі Ялоўшчына, Пурышскага сельсовета, да дня выбараў рыхтуе вялікую праграму. Падрыхтаваны масавыя народныя танцы: «Крыжачок», «Лявоніха», «Падушачкі», усходнія танцы і т. д. У вёсцы Капліца гэтага-ж сельсовета арганізуецца калектыў чытчыкаў.

Шырока разгарнулася самадзейнасць у Індурскім Доме соцкультуры. Індурскі танцавальны калектыў, прэміраваны на абласной алімпіядзе мастацкай самадзейнасці, узмоцнена працуе над новай праграмай да дня выбараў. Ужо дадзена некалькі канцэртаў для выбаршчыкаў. Ідзе масавая падрыхтоўка зацейнікаў, арганізуюцца гульні, танцы, якія будуць праведзены на ўчастках у дзень выбараў.

Ю. Ленскі.

—о—

ЭЛЕКТРАГАДЗІННІКІ НА ВУЛІЦАХ ГОРАДА

У Беластоку на рагу Совецкай і Ленінскай, Совецкай і Кастрычніцкай, Чырвонаармейскай і Чкалава ўстаноўлены электрагадзіннікі.

У бліжэйшы час электрагадзіннікі будуць устаноўлены над брамай аблвыканкома, на рагу Ленінскай і Чырвонаармейскай, на вуліцы Міцкевіча на будынку педагагічнага вучылішча і ў радзе іншых пунктаў горада.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ

ДА ВЕДАМА ХАТНІХ ГАСПАДЫНЬ І ХАТНІХ РАБОТНІЦ!

Велізарны ўрон народнай гаспадарцы штогодна прыносяць пажары. Галоўнай прычынай іх узнікнення з'яўляецца неасцярожнасць у звароце з агнём. Для таго, каб не дапусціць узнікнення пажару і не падвяргаць сябе небяспецы, кожная хатняя гаспадыня, хатняя работніца і іншыя асобы, звязаныя з топкай пячэй і падрыхтаваннем гарачай стравы, павінны строга захоўваць наступныя правілы:

Не астаўляць без нагляду палячайся печы, газоўкі або прымуса;

Не дапускаць наліванне газы ў гарачую газоўку, лямпу і перагрэты прымус;

Не астаўляць малых дзяцей без нагляду ў кватэры;

Празмерна не накачваць прымусаў і на іх не ставіць цяжкіх кастрюль, катлоў;

Не карыстацца прымусамі, газоўкамі для абагравання кватэр і не астаўляць іх запаленымі ў карыдоры і іншых месцах;

Не рабіць разагравання трубаправодаў зімой паяльнымі лямпамі;

Гарачыя вуглі, попел не высыпаць на двор у непрыстасаваным для гэтага месцы;

Электрычныя награвальныя прыборы неабходна ўстанаўляць на вогнетрывалыя падстаўкі і ні ў якім выпадку не астаўляць гэтыя прылады без нагляду;

Не распальваць пячэй газай або бензінам і не захоўваць апошнія ў кватэры ў адкрытай шкляной пасудзе;

Не рабіць сушку дрэва каля пячэй і не заграмаджаць праходы і праезды агульнага карыстання.

Пры захоўванні ўсіх гэтых нескладаных правілаў у звароце з апальваючымі і награвальнымі прыборамі вы можаце не дапусціць узнікнення пажару.

Для ўмацавання пажарнай безапаснасці ў жылых дамах неабходна ўступіць у добраахвотнае пажарнае таварыства і дабіцца таго, каб у кожным доме, ва ўстановах, на прадпрыемствах была арганізавана ячэйка гэтага таварыства.

Аддзел пажарнай аховы Ўпраўлення НКУС па Беластоцкай вобласці.

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ — 125. Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластоцдрук.